Закон Рэспублікі Беларусь
Аб пенсіённым забеспячэнні

Закон Республики Беларусь
О пенсионном обеспечении



Закон Рэспублікі Беларусь Аб пенсіённым забеспячэнні

Закон Республики Беларусь О пенсионном обеспечении

МІНСК «БЕЛАРУСЬ» 1992

ББК 67.99(2)76
З-19

Выпушчана па дзяржаўнаму заказу

З дзяржбюджэту выдаткавана на выданне 24 тыс. руб.

Официальное издание

ЗАКОН РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
«О ПЕНСИОННОМ ОБЕСПЕЧЕНИИ»

Минск, издательство «Беларусь»
На белорусском и русском языках

Афіцыйнае выданне

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
«АБ ПЕНСІЁННЫМ ЗАБЕСПЯЧЭННІ»

Адказная за выпуск Т. Ф. Есіпенка. Мастак М. М. Грыбаў
Мастацкі рэдактар І. Р. Славянін. Тэхнічны рэдактар С. Л. Сармант.
Карэктары Л. Ф. Ліхадзіеўская, Г. Б. Красоўская, Ю. Ц. Петрыкеева.

Здадзена ў набор 25.05.92. Падп. да друку 15.06.92. Фармат 84×108 1/32. Папера газетная. Гарнітура літаратурная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 5,04. Ум. фарб. адб. 5,14. Ул.-выд. арк. 4,6. Тыраж 28 500 экз. Зак. 1073. Цана 6 р.

Ордэна Дружбы народаў выдавецтва «Беларусь» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку»
220041, пр. Ф. Скарыны, 79

Закон Рэспублікі Беларусь «Аб пенсіённым забеспячэнні»=Закон Республики Беларусь «О пенсионном обеспечении»: Прыняты на сес. Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 17 крас. 1992 г.—Мн.: Беларусь, 1992.— 96 с.
З-19
ISBN 5-338-01071-2.

З $\frac{1203020800-074}{М\ 301(03)-92}$ БЗ 196—92 ББК 67.99(2)76

ISBN 5-338-01071-2

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб пенсіённым забеспячэнні

Прыняты на сесіі
Вярхоўнага Савета
Рэспублікі Беларусь
17 красавіка 1992 г.

Раздзел I.
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. **Права грамадзян у Рэспубліцы Беларусь на дзяржаўнае пенсіённае забеспячэнне**

Грамадзяне Рэспублікі Беларусь маюць права на дзяржаўнае пенсіённае забеспячэнне ў старасці, пры інваліднасці, страце карміцеля і ў іншых выпадках, прадугледжаных гэтым Законам.

Пенсіённае забеспячэнне грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія пражываюць за яе межамі, праводзіцца на аснове пагадненняў (дагавораў) з іншымі дзяржавамі.

Грамадзяне іншых дзяржаў і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, маюць права на пенсію нараўне з грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

У тых выпадках, калі пагадненнямі (дагаворамі) аб сацыяльным забеспячэнні паміж Рэспублікай Беларусь і іншымі дзяржавамі прадугледжаны іншыя правілы, чым тыя, якія змяшчаюцца ў гэтым Законе, адпаведна прымяняюцца правілы, устаноўленыя гэтымі пагадненнямі (дагаворамі).

Артыкул 2. **Пенсіённае забеспячэнне ваеннаслужачых і іх сем'яў**

Умовы, нормы і парадак пенсіённага забеспячэння ваеннаслужачых, а таксама асоб начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў і членаў іх сем'яў рэгулююцца заканадаўствам аб пенсіённым забеспячэнні ваеннаслужачых.

Ваеннаслужачым, асобам начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў і членам іх сем'яў прадастаўляецца таксама права на атрыманне пенсій на падставах, прадугледжаных гэтым Законам. Пры гэтым усе віды грашовага забеспячэння ваеннаслужачых, а таксама асоб начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў улічваюцца нараўне з заработнай платай рабочых і служачых.

Артыкул 3. **Пенсіённае забеспячэнне асоб, пацярпеўшых у выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, і членаў іх сем'яў**

Пенсіённае забеспячэнне асоб, пацярпеўшых у выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, і членаў іх сем'яў праводзіцца з улікам умоў і норм, прадугледжаных Законам Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС».

Артыкул 4. **Віды пенсій**

Па гэтаму Закону назначаюцца:
а) працоўныя пенсіі:
па ўзросту;
па інваліднасці;
з выпадку страты карміцеля;
за выслугу гадоў;
б) сацыяльныя пенсіі.

Артыкул 5. **Асобы, якія маюць права на пенсію**

Права на працоўную пенсію маюць асобы, занятыя грамадска карыснай працай або іншай дзейнасцю, якая залічваецца ў стаж работы (частка першая і пункты «а» — «н» артыкула 51 гэтага Закона), і іх сем'і, а таксама навучэнцы агульнаадукацыйных школ (пункт «ж» артыкула 29) пры захаванні іншых умоў, прадугледжаных гэтым Законам.

Непрацаздольныя грамадзяне, якія не атрымліваюць працоўную пенсію, маюць права на сацыяльную пенсію на ўмовах, што вызначаюцца гэтым Законам.

Артыкул 6. **Права выбару пенсіі**

Асобам, якія маюць адначасова права на розныя дзяржаўныя пенсіі, назначаецца адна пенсія па іх выбару.

Артыкул 7. **Зварот за назначэннем пенсіі**

Зварот за назначэннем пенсіі можа ажыццяўляцца ў любы час пасля ўзнікнення права на пенсію без абмежавання якім-небудзь тэрмінам.

Пры гэтым пенсіі па ўзросту і па інваліднасці назначаюцца незалежна ад таго, спынена работа да часу звароту за пенсіяй або працягваецца. Пенсіі за выслугу гадоў назначаюцца пры пакіданні работы, якая дае права на гэту пенсію.

Артыкул 8. **Сродкі на выплату пенсій. Вызваленне пенсій ад падаткаў**

Выплата пенсій ажыццяўляецца з фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь не ўваходзіць у склад дзяржаўнага бюджэту Рэспублікі Беларусь, фарміруецца за кошт узносаў работадаўцаў, страхавых узносаў асоб, якія займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю, абавязковых страхавых узносаў грамадзян, а таксама сродкаў дзяржаўнага бюджэту Рэспублікі Беларусь.

Палажэнне аб Фондзе сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь і тарыфы страхавых узносаў зацвярджаюцца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь.

Пенсіі, якія выплачваюцца ў адпаведнасці з гэтым Законам, не падлягаюць абкладанню падаткамі.

Артыкул 9. **Органы, якія ажыццяўляюць пенсіённае забеспячэнне**

Пенсіённае забеспячэнне па гэтаму Закону праводзіцца органамі сацыяльнага забеспячэння. Кіраванне Фондам сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца ў парадку, які вызначаецца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 10. **Пытанні, якія адносяцца да ведання Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь**

Да ведання Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, апрача прадугледжаных у гэтым Законе, адносяцца таксама пытанні, звязаныя з парадкам назначэння і выплаты пенсій, вызначэннем асаблівасцей вылічэння стажу асобных катэгорый грамадзян з захаваннем гарантый, прадугледжаных гэтым Законам.

Раздзел II.
ПЕНСІІ ПА ЎЗРОСТУ

Артыкул 11. Умовы назначэння пенсій на агульных падставах

Права на пенсію па ўзросту маюць:

мужчыны — па дасягненні 60 гадоў і пры стажы работы не менш 25 гадоў;

жанчыны — па дасягненні 55 гадоў і пры стажы работы не менш 20 гадоў.

Артыкул 12. Пенсіі за работу з асаблівымі ўмовамі працы

Права на пенсію па ўзросту ў сувязі з асаблівымі ўмовамі працы незалежна ад месца апошняй работы маюць:

а) работнікі, занятыя поўны рабочы дзень на падземных работах, на работах з асабліва шкоднымі і асабліва цяжкімі ўмовамі працы,— па спісу № 1 вытворчасцей, работ, прафесій, пасад і паказчыкаў і па выніках атэстацыі рабочых месцаў:

мужчыны — па дасягненні 50 гадоў і пры стажы работы не менш 20 гадоў, з іх не менш 10 гадоў на ўказаных работах;

жанчыны — па дасягненні 45 гадоў і пры стажы работы не менш 15 гадоў, з іх не менш 7 гадоў 6 месяцаў на ўказаных работах.

Работнікам, якія маюць не менш палавіны стажу работы з асабліва шкоднымі і асабліва цяжкімі ўмовамі працы, пры наяўнасці агульнага стажу работы не менш 25 гадоў у мужчын і 20 гадоў у жанчын пенсіі назначаюцца з памяншэннем узросту, прадугледжанага артыкулам 11 гэтага Закона, на 1 год — за кожны поўны год такой работы мужчынам і за кожныя 9 месяцаў такой работы жанчынам;

б) работнікі, занятыя поўны рабочы дзень на іншых работах са шкоднымі і цяжкімі ўмовамі працы,— па спісу № 2 вытворчасцей, работ, прафесій, пасад і паказчыкаў і па выніках атэстацыі рабочых месцаў:

мужчыны — па дасягненні 55 гадоў і пры стажы работы не менш 25 гадоў, з іх не менш 12 гадоў 6 месяцаў на ўказаных работах;

жанчыны — па дасягненні 50 гадоў і пры стажы работы не менш 20 гадоў, з іх не менш 10 гадоў на ўказаных работах.

Работнікам, якія маюць не менш палавіны стажу работы са шкоднымі і цяжкімі ўмовамі працы, пры наяўнасці агульнага стажу работы не менш 25 гадоў у мужчын і 20 гадоў у жанчын пенсіі назначаюцца з памяншэннем узросту, прадугледжанага артыкулам 11 гэтага Закона, на 1 год — за кожныя 2 гады 6 месяцаў такой работы мужчынам і за кожныя 2 гады такой работы жанчынам;

в) работніцы тэкстыльнай вытворчасці, занятыя на станках і машынах,— па спісу вытворчасцей і прафесій, які зацвярджаецца ў парадку, што вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь,— па дасягненні 50 гадоў і пры стажы ўказанай работы не менш 20 гадоў;

г) жанчыны, якія працуюць трактарыстамі-машыністамі, машыністамі будаўнічых, дарожных і пагрузачна-разгрузачных машын, зманціраваных на базе трактароў і экскаватараў,— па дасягненні 50 гадоў і пры агульным стажы работы не менш 20 гадоў, з іх не менш 15 гадоў на ўказанай рабоце;

д) трактарысты-машыністы, непасрэдна занятыя ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў калгасах, саўгасах і іншых прадпрыемствах сельскай гаспадаркі: мужчыны — па дасягненні 55 гадоў і пры агульным стажы работы не менш 25 гадоў, з іх не менш 20 гадоў на ўказанай рабоце;

е) жанчыны, якія працуюць даяркамі (аператарамі машыннага даення), цялятніцамі, свінарамі-аператарамі ў калгасах, саўгасах, іншых прадпрыемствах сельскай гаспадаркі,— па дасягненні 50 гадоў і пры стажы ўказанай работы не менш 20 гадоў пры ўмове выканання ўстаноўленых норм абслугоўвання.

Нормы абслугоўвання для гэтых мэт устанаўліваюцца ў парадку, які вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

ж) вадзіцелі гарадскога пасажырскага транспарту (аўтобусы, тралейбусы, трамваі) і асобных прыгарадных маршрутаў, па ўмовах працы прыраўнаваных да гарадскіх перавозак:

мужчыны — па дасягненні 55 гадоў і пры стажы работы не менш 25 гадоў, з іх не менш 20 гадоў на ўказанай рабоце;

жанчыны — па дасягненні 50 гадоў і пры стажы

работы не менш 20 гадоў, з іх не менш 15 гадоў на ўказанай рабоце.

Прыраўнаванне асобных прыгарадных маршрутаў па ўмовах працы да гарадскіх перавозак праводзіцца ў парадку, які вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Прадпрыемствы і арганізацыі са сродкаў, прызначаных на аплату працы, кампенсуюць Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь расходы на выплату пенсій у адпаведнасці з пунктам «б» гэтага артыкула з разліку трох працэнтаў рабочых месцаў са шкоднымі і цяжкімі ўмовамі працы ў размеры: 70 працэнтаў — у 1993 годзе, 80 працэнтаў — у 1994 годзе, 90 працэнтаў — у 1995 годзе і 100 працэнтаў — з 1996 года.

У перыяд да 1996 года работнікам іншых вытворчасцей, прафесій і пасад датэрміновыя пенсіі ў залежнасці ад умоў працы (але не раней чым па дасягненні 55 гадоў мужчынамі і 50 гадоў жанчынамі) могуць устанаўлівацца па выніках атэстацыі рабочых месцаў за кошт сродкаў прадпрыемстваў і арганізацый, прызначаных на аплату працы, да дасягнення работнікам пенсіённага ўзросту, прадугледжанага артыкулам 11 гэтага Закона.

Артыкул 13. **Пенсіі работнікам, занятым на падземных і адкрытых горных работах**

Работнікі, непасрэдна занятыя поўны рабочы дзень на падземных і адкрытых горных работах (уключаючы асабовы склад горнавыратавальных часцей) па здабычы вугалю, сланцу, руды, граніту і іншых карысных выкапняў, на будаўніцтве шахт і руднікоў (па спісу работ і прафесій), маюць права на пенсію незалежна ад узросту, калі яны былі заняты на гэтых работах не менш 25 гадоў, а работнікі вядучых прафесій на гэтых работах: горнарабочыя ачышчальнага забою, праходчыкі, забойшчыкі на адбойных малатках, машыністы горных выемачных машын — пры ўмове, калі яны былі заняты на гэтых работах не менш 20 гадоў.

Пры наяўнасці стажу на падземных работах менш 10 гадоў у мужчын і менш 7 гадоў 6 месяцаў у жанчын і агульнага стажу не менш 25 гадоў у мужчын і не менш 20 гадоў у жанчын пенсіённы ўзрост, прадугледжаны артыкулам 11 гэтага Закона, зніжаецца на 1 год — за кожны поўны год такой работы мужчынам і за кожныя 9 месяцаў такой работы жанчынам.

Артыкул 14. **Спісы работ і вытворчасцей з асаблівымі ўмовамі працы і кантроль за правільнасцю іх прымянення**

Пры назначэнні пенсіі за работу з асаблівымі ўмовамі працы (пункты «а» і «б» артыкула 12 і артыкул 13) прымяняюцца спісы вытворчасцей, работ, прафесій, пасад і паказчыкаў, якія зацвярджаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Кантроль за правільнасцю прымянення спісаў вытворчасцей, работ, прафесій, пасад і паказчыкаў з асаблівымі ўмовамі працы на прадпрыемствах і ў арганізацыях і якасцю правядзення атэстацыі працоўных месцаў, падрыхтоўка заключэнняў па гэтых пытаннях і прапаноў па ўдасканаленню спісаў і парадку іх прымянення ўскладаюцца на органы дзяржаўнай экспертызы ўмоў працы Рэспублікі Беларусь. Палажэнне аб органах дзяржаўнай экспертызы ўмоў працы і парадак правядзення атэстацыі рабочых месцаў зацвярджаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 15. **Парадак назначэння пенсій за работу з асаблівымі ўмовамі працы асобам, якія мелі права на яе да ўвядзення ў дзеянне гэтага Закона**

Асобам, якія працавалі да ўвядзення ў дзеянне гэтага Закона на работах са шкоднымі і цяжкімі ўмовамі працы, прадугледжаных раней дзеючымі спісамі № 1 і № 2, пенсіі па ўзросту назначаюцца на наступных умовах:

а) асобам, якія маюць да дня ўвядзення ў дзеянне гэтага Закона поўны стаж на ўказаных работах, што даваў права на пенсію на льготных умовах, пенсіі ў размерах, прадугледжаных гэтым Законам, назначаюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі па ўзросту і стажу, устаноўленымі раней дзеючым заканадаўствам;

б) асобам, якія не маюць поўнага стажу работы са шкоднымі і цяжкімі ўмовамі працы, узрост, што патрабуецца для назначэння пенсіі ў адпаведнасці з артыкулам 11, зніжаецца прапарцыянальна наяўнаму стажу ў парадку, прадугледжаным пунктамі «а» і «б» артыкула 12 гэтага Закона зыходзячы з патрабаванняў гэтага стажу, устаноўленых раней дзеючым заканадаўствам.

Артыкул 16. **Узаемны залік перыядаў работы з рознымі ўмовамі працы**

Пры назначэнні пенсіі за работу з асаблівымі ўмовамі

працы ў адпаведнасці з артыкулам 12 гэтага Закона праводзіцца ўзаемны залік перыядаў работы, прадугледжаных гэтым артыкулам, пры ўмове, што ўказаныя работы даюць права на пенсію на аналагічных або больш ільготных умовах.

Артыкул 17. **Пенсіі інвалідам вайны**

Ваеннаслужачыя, якія сталі інвалідамі з прычыны ранення, кантузіі або калецтва, атрыманых пры выкананні абавязкаў ваеннай службы або з прычыны захворвання, звязанага са знаходжаннем на фронце, маюць права на пенсію па ўзросту:

мужчыны — па дасягненні 55 гадоў і пры стажы работы не менш 25 гадоў;

жанчыны — па дасягненні 50 гадоў і пры стажы работы не менш 20 гадоў.

Артыкул 18. **Пенсіі маці ваеннаслужачых**

Маці ваеннаслужачых, смерць якіх звязана з выкананнем абавязкаў ваеннай службы, маюць права на пенсію па ўзросту па дасягненні 50 гадоў і пры стажы работы не менш 20 гадоў.

Артыкул 19. **Пенсіі мнагадзетным маці**

Жанчыны, нарадзіўшыя пяць і больш дзяцей і выхаваўшыя іх да 8-гадовага ўзросту, маюць права на пенсію па ўзросту па дасягненні 50 гадоў (а таксама жанчыны, у якіх на гэты час пятае дзіця не дасягнула 8 гадоў) і пры стажы работы не менш 15 гадоў.

Жанчыны, нарадзіўшыя пяць і больш дзяцей і выхаваўшыя іх да 16-гадовага ўзросту, пры стажы работы ў калгасах, саўгасах і іншых прадпрыемствах сельскай гаспадаркі непасрэдна ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі не менш 10 гадоў (без заліку ў стаж часу догляду за дзецьмі) маюць права на пенсію незалежна ад узросту.

Артыкул 20. **Пенсіі бацькам інвалідаў з дзяцінства**

Маці інвалідаў з дзяцінства, якія выхоўвалі іх не менш 8 гадоў, маюць права на пенсію па ўзросту па дасягненні 50 гадоў і пры стажы работы не менш 20 гадоў.

Бацькі інвалідаў з дзяцінства, якія выхоўвалі іх не менш 8 гадоў, маюць права на пенсію па ўзросту па дасягненні 55 гадоў і пры стажы работы не менш 25 гадоў, калі маці інваліда з дзяцінства (дзіцяці-інваліда) адмо-

вілася ад права на пенсію па ўзросту ў адпаведнасці з часткай першай гэтага артыкула на карысць бацькі.

Артыкул 21. **Пенсіі ліліпутам і карлікам**

Асобы, хворыя гіпафізарным нанізмам (ліліпуты), і дыспрапарцыянальныя карлікі маюць права на пенсію па ўзросту:

мужчыны — па дасягненні 45 гадоў і пры стажы работы не менш 20 гадоў;

жанчыны — па дасягненні 40 гадоў і пры стажы работы не менш 15 гадоў.

Артыкул 22. **Пенсіі інвалідам з дзяцінства**

Інваліды з дзяцінства маюць права на пенсію па ўзросту:

мужчыны — па дасягненні 55 гадоў і пры стажы работы не менш 25 гадоў;

жанчыны — па дасягненні 50 гадоў і пры стажы работы не менш 20 гадоў.

Артыкул 23. **Размеры пенсій**

Пенсіі па ўзросту назначаюцца ў размеры 55 працэнтаў сярэднямесячнага заработку (артыкул 56), але не ніжэй мінімальнага размеру пенсіі.

За кожны поўны год работы звыш 25 гадоў мужчынам і 20 гадоў жанчынам, а таксама за кожны поўны год работы з асаблівымі ўмовамі працы (пункт «а» артыкула 12 і артыкул 13) звыш 10 гадоў у мужчын і 7 гадоў 6 месяцаў у жанчын пенсія, у тым ліку мінімальная, павялічваецца на адзін працэнт заработку, але не менш чым на адзін працэнт мінімальнага размеру пенсіі. Павелічэнне праводзіцца ў межах 20 працэнтаў заработку (мінімальнага размеру пенсіі).

Мінімальны размер пенсіі па ўзросту ўстанаўліваецца ў размеры 100 працэнтаў мінімальнай заработнай платы, якая вызначаецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 24. **Пенсіі пры няпоўным стажы работы**

Асобам, якія не маюць дастатковага для назначэння поўнай пенсіі стажу работы (артыкул 11), назначаюцца пенсіі па ўзросту пры няпоўным стажы ў размеры, вылічаным прапарцыянальна наяўнаму стажу, але не менш 50 працэнтаў, а маці-гераіням — не менш 100 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту (артыкул 23).

Пры назначэнні пенсій пры няпоўным стажы не прымяняюцца льготныя ўмовы па ўзросту і стажу для назначэння пенсій, устаноўленыя гэтым Законам.

Артыкул 25. **Надбаўка да пенсіі**

Да пенсіі па ўзросту ўстанаўліваецца надбаўка на догляд:

інвалідам I групы — 100 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту;

пенсіянерам, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту, а таксама іншым адзінокім пенсіянерам, якія маюць патрэбу па заключэнню медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій (МРЭК) або ўрачэбна-кансультацыйных камісій (УКК) у пастаяннай пабочнай дапамозе,— 50 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту.

Пры наяўнасці права на надбаўку на догляд па розных падставах, прадугледжаных у гэтым артыкуле, надбаўка налічваецца па адной з указаных падстаў.

Артыкул 26. **Перыяд, на які назначаецца пенсія**

Пенсія па ўзросту назначаецца пажыццёва незалежна ад стану працаздольнасці.

Раздзел III.
ПЕНСІІ ПА ІНВАЛІДНАСЦІ

Артыкул 27. **Умовы назначэння пенсій**

Пенсіі па інваліднасці назначаюцца ў выпадку надыходу інваліднасці з прычыны:

а) працоўнага калецтва або прафесіянальнага захворвання;

б) агульнага захворвання (у тым ліку калецтва, не звязанага з работай, інваліднасці з дзяцінства).

Пенсіі па інваліднасці назначаюцца незалежна ад таго, калі настала інваліднасць,— у перыяд работы, да паступлення на работу або пасля спынення работы.

Артыкул 28. **Групы інваліднасці**

У залежнасці ад ступені страты працаздольнасці інваліды падраздзяляюцца на тры групы.

Прычыны і групы інваліднасці, а таксама час, калі настала інваліднасць, устанаўліваюцца медыка-рэабілітацыйнымі экспертнымі камісіямі (МРЭК), якія дзейнічаюць на падставе Палажэння аб іх, што зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 29. **Інваліднасць з прычыны працоўнага калецтва або прафесіянальнага захворвання**

Інваліднасць лічыцца настаўшай з прычыны працоўнага калецтва, калі няшчасны выпадак, які выклікаў інваліднасць, адбыўся (акрамя выпадкаў проціпраўнага дзеяння):

а) пры выкананні працоўных абавязкаў (у тым ліку ў час камандзіроўкі), а таксама пры выкананні якіх-небудзь дзеянняў у інтарэсах прадпрыемства або арганізацыі, хоць бы і без спецыяльнага даручэння;

б) па дарозе на работу або з работы;

в) на тэрыторыі прадпрыемства, арганізацыі або ў іншым месцы работы на працягу рабочага часу (уключаючы і ўстаноўленыя перапынкі), неабходнага для прывядзення ў парадак прылад вытворчасці, адзення і да т. п. перад пачаткам або па заканчэнні работы;

г) паблізу прадпрыемства, арганізацыі або іншага месца работы на працягу рабочага часу (уключаючы

і ўстаноўленыя перапынкі), калі знаходжанне там не супярэчыла правілам унутранага працоўнага распарадку;

д) пры выкананні дзяржаўных абавязкаў, заданняў органаў дзяржаўнай улады і кіравання, а таксама грамадскіх арганізацый, зарэгістраваных ва ўстаноўленым парадку, хоць бы гэтыя заданні і не былі звязаны з асноўнай работай;

е) пры выкананні грамадзянскага абавязку па выратаванню чалавечага жыцця, па ахове ўласнасці і правапарадку;

ж) пры праходжанні студэнтамі і навучэнцамі вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, вучылішчаў, школ, у тым ліку агульнаадукацыйных, курсаў па падрыхтоўцы кадраў, аспірантамі і клінічнымі ардынатарамі вытворчага навучання або практыкі, практычных заняткаў.

Спіс прафесіянальных захворванняў зацвярджаецца ў парадку, які вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 30. **Стаж работы, які дае права на пенсію**

Пенсіі па інваліднасці з прычыны працоўнага калецтва або прафесіянальнага захворвання (артыкул 29) назначаюцца незалежна ад стажу работы.

Пенсіі па інваліднасці з прычыны агульнага захворвання назначаюцца пры наяўнасці наступнага стажу работы да часу наступлення інваліднасці:

Узрост	Стаж работы (у гадах)
Да дасягнення 23 гадоў	1
Ад 23 гадоў да дасягнення 26 гадоў	2
Ад 26 гадоў да дасягнення 31 года	3
Ад 31 года да дасягнення 36 гадоў	5
Ад 36 гадоў да дасягнення 41 года	7
Ад 41 года да дасягнення 46 гадоў	9
Ад 46 гадоў да дасягнення 51 года	11
Ад 51 года да дасягнення 56 гадоў	13
Ад 56 гадоў да дасягнення 61 года	14
Ад 61 года старэйшы	15

Калі быў набыты стаж работы, неабходны для адпаведнай узроставай групы, і работа працягвалася пры пераходзе ў наступную ўзроставую групу, то ўмова аб

стажы лічыцца выкананай незалежна ад патрабаванняў, устаноўленых для наступнай узроставай групы.

Асобам, якія сталі інвалідамі з прычыны агульнага захворвання ў перыяд работы або пасля яе спынення да дасягнення 20 гадоў, пенсіі назначаюцца незалежна ад стажу работы.

Пры пераводзе з пенсіі па інваліднасці з прычыны працоўнага калецтва або прафесіянальнага захворвання на пенсію па інваліднасці з прычыны агульнага захворвання неабходны стаж вызначаецца па ўзросту да часу першапачатковага ўстанаўлення інваліднасці.

Артыкул 31. **Размеры пенсій**

Пенсіі па інваліднасці назначаюцца ў наступных размерах:

інвалідам I групы — 75 працэнтаў, інвалідам II групы — 65 працэнтаў, інвалідам III групы — 40 працэнтаў сярэднямесячнага заработку (артыкул 56).

Калі ў інвалідаў I, II груп ёсць стаж работы, неабходны для назначэння пенсіі па ўзросту, у тым ліку за работу з асаблівымі ўмовамі працы, то пенсія па інваліднасці можа быць назначана ў размеры пенсіі па ўзросту пры адпаведным стажы работы.

Мінімальныя размеры пенсій устанаўліваюцца: па I і II групах інваліднасці — 100 працэнтаў, па III групе інваліднасці — 50 працэнтаў, маці-гераіням (незалежна ад групы інваліднасці) — 100 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту (артыкул 23).

Артыкул 32. **Пенсіі пры няпоўным стажы работы**

Інвалідам I, II груп з прычыны агульнага захворвання, якія не маюць дастатковага для назначэння поўнай пенсіі стажу работы (артыкул 30), назначаецца пенсія па інваліднасці пры няпоўным стажы ў размеры, вылічаным прапарцыянальна наяўнаму стажу, але не ніжэй наступных размераў: інвалідам I групы — 100 працэнтаў, інвалідам II групы — 50 працэнтаў, маці-гераіням (незалежна ад групы інваліднасці) — не менш 100 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту.

Артыкул 33. **Надбаўка да пенсіі**

Да пенсіі па інваліднасці ўстанаўліваецца надбаўка на догляд:

інвалідам I групы — 100 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту;

адзінокім інвалідам II групы, якія маюць патрэбу па заключэнню МРЭК або УКК у пастаяннай пабочнай

дапамозе, а таксама пенсіянерам, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту,— 50 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту.

Пры наяўнасці права на надбаўку на догляд па розных падставах, прадугледжаных у гэтым артыкуле, надбаўка налічваецца па адной з указаных падстаў.

Артыкул 34. **Перыяд, на які назначаецца пенсія**

Пенсія назначаецца на ўвесь час інваліднасці, устаноўленай МРЭК. Інвалідам-мужчынам, старэйшым за 55 гадоў, і жанчынам, старэйшым за 50 гадоў, пенсія па інваліднасці назначаецца пажыццёва. Паўторны агляд гэтых інвалідаў праводзіцца толькі па іх заяве.

Раздзел IV.
ПЕНСІІ З ВЫПАДКУ СТРАТЫ КАРМІЦЕЛЯ

Артыкул 35. **Члены сям'і, якія маюць права на пенсію**

Права на пенсію з выпадку страты карміцеля маюць непрацаздольныя члены сям'і памёршага карміцеля, якія знаходзіліся на яго ўтрыманні (артыкул 36). Пры гэтым дзецям, а таксама асобам, указаным у пункце «в» гэтага артыкула, пенсіі назначаюцца незалежна ад таго, ці былі яны на ўтрыманні карміцеля.

Бацькі і муж (жонка) памёршага, якія не былі на яго ўтрыманні, таксама маюць права на пенсію, калі ў далейшым страцілі крыніцу сродкаў да існавання.

Непрацаздольнымі членамі сям'і лічацца:

а) дзеці (у тым ліку ўсыноўленыя, пасынкі і падчарыцы), браты, сёстры і ўнукі, якія не дасягнулі 18 гадоў і старэйшыя за гэты ўзрост, калі яны сталі інвалідамі да дасягнення 18 гадоў, пры гэтым браты, сёстры і ўнукі — пры ўмове, калі яны не маюць працаздольных бацькоў, пасынак і падчарыца — калі яны не атрымлівалі аліментаў ад бацькоў;

б) бацька, маці (усынавіцелі), муж і жонка, калі яны дасягнулі пенсіённага ўзросту (мужчыны — 60 гадоў, жанчыны — 55 гадоў) або з'яўляюцца інвалідамі;

в) адзін з бацькоў або муж (жонка) ці дзед, баба, брат або сястра незалежна ад узросту і працаздольнасці, калі ён (яна) заняты (занята) доглядам за дзецьмі, братамі, сёстрамі або ўнукамі памёршага карміцеля, не дасягнуўшымі 8 гадоў, і не працуе;

г) дзед і баба — пры адсутнасці асоб, якія па закону абавязаны іх утрымліваць;

д) айчым, мачаха, калі яны дасягнулі пенсіённага ўзросту (мужчыны — 60 гадоў, жанчыны — 55 гадоў) або з'яўляюцца інвалідамі,— пры ўмове, калі выхоўвалі або ўтрымлівалі памёршага пасынка або падчарыцу не менш 5 гадоў.

Навучэнцы агульнаадукацыйных школ, прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў, навучэнцы і студэнты дзённых аддзяленняў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў маюць права на пенсію з выпадку страты

карміцеля да заканчэння ўказаных навучальных устаноў, але не больш чым да дасягнення імі 23-гадовага ўзросту.

Усе правілы гэтага Закона, якія датычацца сем'яў памёршых, адпаведна распаўсюджваюцца і на сем'і адсутных без вестак, калі адсутнасць без вестак карміцеля засведчана ва ўстаноўленым парадку.

Артыкул 36. **Члены сям'і, якія лічацца ўтрыманцамі**

Члены сям'і памёршага лічацца быўшымі на яго ўтрыманні, калі яны знаходзіліся на яго поўным утрыманні або атрымлівалі ад яго дапамогу, якая была для іх і асноўнай крыніцай сродкаў да існавання.

Члены сям'і памёршага, для якіх яго дапамога была пастаяннай і асноўнай крыніцай сродкаў да існавання, але якія самі атрымлівалі якую-небудзь пенсію, маюць права перайсці на новую пенсію.

Артыкул 37. **Стаж работы карміцеля, які дае права на пенсію**

Сям'і карміцеля, памёршага з прычыны працоўнага калецтва або прафесіянальнага захворвання, а таксама сям'і памёршага пенсіянера пенсія назначаецца незалежна ад стажу работы карміцеля.

Пенсія з выпадку страты карміцеля, памёршага з прычыны агульнага захворвання або калецтва, не звязанага з работай, назначаецца, калі карміцель да дня смерці меў стаж, які быў бы неабходны яму для назначэння пенсіі па інваліднасці (артыкул 30).

Сем'ям грамадзян Рэспублікі Беларусь — перасяленцаў з іншых дзяржаў, калі карміцель не працаваў у Рэспубліцы Беларусь, пенсіі назначаюцца:

а) атрымліваўшым у іншых дзяржавах пенсію з выпадку страты карміцеля — незалежна ад стажу работы карміцеля;

б) не атрымліваўшым пенсіі — пры ўмове, калі карміцель па ўзросту да дня спынення работы меў адпаведны стаж (артыкул 30), а ў выпадку смерці яго з прычыны працоўнага калецтва або прафесіянальнага захворвання — незалежна ад стажу работы карміцеля.

Артыкул 38. **Размеры пенсій**

Пенсіі з выпадку страты карміцеля назначаюцца на кожнага непрацаздольнага члена сям'і ў размеры 30 працэнтаў сярэднямесячнага заработку карміцеля (арты-

кул 56), але не менш 100 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту.

На дзяцей, якія страцілі абодвух бацькоў (круглых сірот), або дзяцей памёршай адзінокай маці пенсія на кожнае дзіця не можа быць менш двухкратнага мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту.

Артыкул 39. **Захаванне пенсіі пры ўступленні ў новы шлюб**

Пенсія, назначаная з выпадку смерці мужа, захоўваецца і пры ўступленні пенсіянера ў новы шлюб.

Артыкул 40. **Права на пенсію ўсыноўленых**

Непаўналетнія, якія маюць права на пенсію з выпадку страты карміцеля, захоўваюць гэта права таксама і пры іх усынаўленні.

Артыкул 41. **Пенсіі пры няпоўным стажы работы**

Членам сям'і, якая страціла карміцеля, памёршага з прычыны агульнага захворвання і не меўшага стажу, дастатковага для назначэння поўнай пенсіі па інваліднасці (артыкул 30), назначаецца пенсія пры няпоўным стажы ў размеры, вылічаным прапарцыянальна наяўнаму стажу работы карміцеля.

Сем'ям памёршых пенсіянераў, атрымліваўшых пенсію пры няпоўным стажы, пенсія назначаецца прапарцыянальна стажу работы, зыходзячы з якога была назначана пенсія памёршаму карміцелю.

Пенсія на кожнага непрацаздольнага члена сям'і не можа быць менш 50 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту. Пры гэтым пенсія, якая назначаецца на дзіця — круглага сірату або дзіця памёршай адзінокай маці, не можа быць менш размеру, прадугледжанага часткай другой артыкула 38 гэтага Закона, а на маці-гераіню — не менш 100 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту.

Артыкул 42. **Права на зварот за назначэннем пенсіі без абмежавання тэрмінам**

Сям'я, якая мае права на пенсію з выпадку страты карміцеля, можа звяртацца за назначэннем пенсіі ў любы час пасля смерці або ўстанаўлення адсутнасці без вестак карміцеля без абмежавання якім-небудзь тэрмінам.

Пенсіі з выпадку страты карміцеля назначаюцца:

а) сем'ям асоб, указаных у частцы першай артыкула 5 гэтага Закона,— незалежна ад таго, калі памёр кармі-

цель: у перыяд работы (вучобы) або пасля спынення работы (вучобы);

б) сем'ям пенсіянераў — калі карміцель памёр у перыяд атрымання пенсіі або не пазней 5 гадоў пасля спынення выплаты пенсіі.

Артыкул 43. **Перыяд, на які назначаецца пенсія**

Пенсія з выпадку страты карміцеля ўстанаўліваецца на ўвесь перыяд, на працягу якога член сям'і памёршага лічыцца непрацаздольным згодна з артыкулам 35 гэтага Закона.

Артыкул 44. **Назначэнне пенсіі на кожнага непрацаздольнага члена сям'і**

Пенсія з прычыны страты карміцеля назначаецца на кожнага непрацаздольнага члена сям'і, які мае права на пенсію (артыкул 35).

Па жаданню членаў сям'і ім можа быць назначана адна агульная пенсія.

Артыкул 45. **Парадак і тэрміны ўстанаўлення інваліднасці членам сям'і**

На членаў сям'і, якія з'яўляюцца інвалідамі, адпаведна распаўсюджваюцца правілы, выкладзеныя ў артыкулах 28, 34, пунктах «а» і «б» артыкула 81, частках першай і другой артыкула 89 гэтага Закона.

Раздзел V.
ПЕНСІІ ЗА ВЫСЛУГУ ГАДОЎ

Артыкул 46. **Падставы для пенсіённага забеспячэння за выслугу гадоў**

Пенсіі за выслугу гадоў устанаўліваюцца асобным катэгорыям грамадзян (артыкулы 47—49), занятых на работах, выкананне якіх вядзе да страты прафесіянальнай працаздольнасці або прыгоднасці, да наступлення ўзросту, які дае права на пенсію па ўзросту.

Артыкул 47. **Умовы назначэння пенсій асобным катэгорыям работнікаў авіяцыі і лётна-выпрабавальнага складу**

Права на пенсію за выслугу гадоў маюць наступныя катэгорыі рабочых і служачых авіяцыі, а таксама лётна-выпрабавальнага складу незалежна ад ведамаснай падпарадкаванасці прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, у якіх яны заняты:

а) работнікі лётнага і лётна-выпрабавальнага складу пры выслузе гадоў на гэтых пасадах не менш 25 гадоў у мужчын і менш 20 гадоў у жанчын.

Указаныя работнікі, звольненыя з лётнай работы па стану здароўя (хваробы), пры наяўнасці выслугі гадоў у мужчын не менш 20 гадоў і ў жанчын не менш 15 гадоў маюць права на пенсію прапарцыянальна адпрацаванаму часу. Далейшая работа ў службах кіравання паветраным рухам і інжынерна-авіяцыйнай на пасадах, якія даюць права на пенсію за выслугу гадоў (пункты «б» і «в» гэтага артыкула), залічваецца ў каляндарным парадку для назначэння поўнай пенсіі за выслугу гадоў.

Пералік пасад работнікаў лётнага і лётна-выпрабавальнага складу, парадак вылічэння тэрмінаў выслугі гадоў для назначэння ім пенсій, а таксама парадак назначэння і выплаты гэтых пенсій зацвярджаюцца ў парадку, які вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

б) работнікі, якія ажыццяўляюць кіраванне паветраным рухам і маюць пасведчанне дыспетчара:

мужчыны — па дасягненні 50 гадоў і пры агульным стажы работы не менш 25 гадоў, з іх не менш 12 гадоў

6 месяцаў работы па непасрэднаму кіраванню палётамі паветраных суднаў;

жанчыны — па дасягненні 45 гадоў і пры агульным стажы работы не менш 20 гадоў, з іх не менш 10 гадоў работы па непасрэднаму кіраванню палётамі паветраных суднаў.

У выслугу гадоў работнікам, якія ажыццяўляюць кіраванне паветраным рухам, залічваецца таксама работа, указаная ў пункце «а» гэтага артыкула;

в) інжынерна-тэхнічны склад — па пераліку пасад і работ, які зацвярджаецца ў парадку, што вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь:

мужчыны — па дасягненні 55 гадоў і пры агульным стажы работы не менш 25 гадоў, з іх не менш 20 гадоў ва ўказаных пасадах;

жанчыны — па дасягненні 50 гадоў і пры агульным стажы работы не менш 20 гадоў, з іх не менш 15 гадоў ва ўказаных пасадах.

У выслугу гадоў работнікам інжынерна-тэхнічнага складу залічваецца таксама работа, указаная ў пунктах «а» і «б» гэтага артыкула;

г) бортправаднікі:

мужчыны — па дасягненні 55 гадоў і пры агульным стажы работы не менш 25 гадоў, з іх не менш 15 гадоў бортправаднікам;

жанчыны — па дасягненні 45 гадоў і пры агульным стажы работы не менш 20 гадоў, з іх не менш 10 гадоў бортправадніцай.

Артыкул 48. **Умовы для назначэння пенсій асобным катэгорыям медыцынскіх і педагагічных работнікаў**

Права на пенсію за выслугу гадоў маюць асобныя катэгорыі медыцынскіх і педагагічных работнікаў:

мужчыны — па дасягненні 55 гадоў і пры наяўнасці спецыяльнага стажу работы не менш 30 гадоў;

жанчыны — па дасягненні 50 гадоў і пры наяўнасці спецыяльнага стажу работы не менш 25 гадоў.

Пералік устаноў, арганізацый і пасад, праца ў якіх дае права на пенсію за выслугу гадоў у адпаведнасці з гэтым артыкулам, зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 49. **Умовы для назначэння пенсій артыстам**

Права на пенсію за выслугу гадоў пры стажы творчай

дзейнасці ад 20 да 30 гадоў маюць асобныя катэгорыі артыстаў тэатраў і іншых тэатральна-відовішчных прадпрыемстваў і калектываў — па пераліку, які зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 50. **Размеры пенсій**

Пенсіі за выслугу гадоў назначаюцца ў размерах, устаноўленых артыкуламі 23, 25 і 68 гэтага Закона для пенсій па ўзросту.

Пенсіі вылічваюцца з сярэднямесячнага заработку, які вызначаецца ў адпаведнасці з артыкуламі 56—58 гэтага Закона.

Раздзел VI.
ВЫЛІЧЭННЕ СТАЖУ РАБОТЫ ДЛЯ НАЗНАЧЭННЯ ПРАЦОЎНЫХ ПЕНСІЙ

Артыкул 51. Віды дзейнасці, якія залічваюцца ў стаж работы

У працоўны стаж залічваецца работа, у перыяд якой работнік падлягаў дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню або выплачваў страхавыя ўзносы ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

Пры вылічэнні стажу работы ў калгасе за перыяд пасля 1965 года, калі член калгаса не выконваў без уважлівых прычын устаноўленага мінімуму працоўнага ўдзелу ў грамадскай гаспадарцы, улічваецца час работы па фактычнай працягласці.

У стаж работы залічваецца таксама:

а) ваенная служба і знаходжанне ў партызанскіх атрадах і злучэннях, служба ў органах дзяржаўнай бяспекі і ў органах унутраных спраў;

б) служба ў ваенізаванай ахове, у органах спецыяльнай сувязі і ў горнавыратавальных часцях незалежна ад ведамаснай падпарадкаванасці і наяўнасці спецыяльнага або воінскага звання;

в) дзённая форма навучання ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, у вучылішчах, школах і на курсах па падрыхтоўцы кадраў, павышэнню кваліфікацыі і перакваліфікацыі, у аспірантуры, клінічнай ардынатуры, дактарантуры;

г) часовая непрацаздольнасць, якая пачалася ў перыяд работы, і час знаходжання на інваліднасці I і II груп з прычыны працоўнага калецтва або прафесіянальнага захворвання, атрыманых работнікам пры выкананні ім працоўных абавязкаў і адбыўшыхся па віне прадпрыемстваў і арганізацый;

д) час догляду за інвалідам I групы або дзіцем-інвалідам ва ўзросце да 16 гадоў, а таксама за састарэлым, які дасягнуў 80-гадовага ўзросту;

е) час догляду за дзіцем ва ўзросце да 16 гадоў, заражаным вірусам імунадэфіцыту або хворым СНІДам;

ж) час догляду непрацуючай маці (у выглядзе выключэння — бацькі) за малалетнімі дзецьмі, але не даўжэй

чым да дасягнення кожным дзіцем узросту 3 гадоў, у межах 9 гадоў увогуле;

з) час утрымання пад вартай, час адбывання пакарання ў месцах пазбаўлення волі і ссылкі грамадзян, неабгрунтавана прыцягнутых да крымінальнай адказнасці і ў далейшым рэабілітаваных;

і) час знаходжання на спецпасяленні грамадзян, якія дасягнулі 12-гадовага ўзросту, неабгрунтавана высланых у перыяд рэпрэсій за межы рэспублікі ў адміністрацыйным парадку і пасля рэабілітаваных;

к) знаходжанне ў месцах пазбаўлення волі звыш тэрміну, назначанага пры пераглядзе справы;

л) час знаходжання на акупіраванай тэрыторыі СССР і іншых дзяржаў у перыяд Вялікай Айчыннай вайны грамадзян, якія дасягнулі да дня акупацыі або ў яе перыяд 16 гадоў, калі яны не ўчынілі ў гэты перыяд злачынстваў супраць Радзімы;

м) час пражывання грамадзян у горадзе Ленінградзе ў перыяд яго блакады ў гады Вялікай Айчыннай вайны з верасня 1941 года па 27 студзеня 1944 года;

н) час знаходжання вязняў, у тым ліку дзяцей, у фашысцкіх канцлагерах (гета і іншых месцах прымусовага ўтрымання ў перыяд вайны), а таксама перыяд знаходжання асоб, насільна вывезеных з часова акупіраванай тэрыторыі ў час Вялікай Айчыннай вайны, на тэрыторыі дзяржаў, якія знаходзіліся ў стане вайны з СССР, калі яны не ўчынілі ў гэты перыяд злачынстваў супраць Радзімы;

о) перыяд пражывання жонак асоб афіцэрскага складу, прапаршчыкаў, мічманаў і ваеннаслужачых звыштэрміновай службы з мужамі ў мясцовасцях, дзе адсутнічала магчымасць іх працаўладкавання, але не больш 10 гадоў увогуле;

п) перыяд пражывання за мяжой жонак (мужоў) работнікаў дзяржаўных устаноў Беларусі, якія знаходзяцца за мяжой, і міжнародных арганізацый, але не больш 10 гадоў увогуле.

Для павелічэння размеру пенсіі па ўзросту за кожны год работы (артыкул 23) разам з работай улічваюцца таксама перыяды, прадугледжаныя пунктамі «а» — «н» гэтага артыкула і артыкуламі 52 і 53 гэтага Закона. Пры гэтым работа пасля назначэння пенсіі па ўзросту залічваецца ў стаж, калі пенсіянер не атрымліваў пенсіі за гэты перыяд (за выключэннем перараздзіку пенсіі, прадугледжанага артыкулам 66 гэтага Закона).

Пры вылічэнні стажу падземнай работы, якая дае

права на пенсію ў сувязі з асаблівымі ўмовамі працы (артыкулы 12 і 13), час знаходжання на інваліднасці з прычыны працоўнага калецтва або прафесіянальнага захворвання, атрыманых на гэтай рабоце, уключаецца ва ўказаны стаж.

Артыкул 52. **Ільготы па вылічэнню стажу**

На льготных умовах у стаж для назначэння пенсіі залічваюцца:

а) ваенная служба ў складзе дзеючай арміі ў перыяд баявых дзеянняў, у тым ліку пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку, а таксама знаходжанне ў партызанскіх атрадах і злучэннях залічваюцца ў стаж на льготных умовах у парадку, устаноўленым для вылічэння тэрмінаў гэтай службы пры назначэнні пенсій за выслугу гадоў ваеннаслужачым;

б) работа ў горадзе Ленінградзе ў перыяд яго блакады ў гады Вялікай Айчыннай вайны з 8 верасня 1941 года па 27 студзеня 1944 года — у трайным размеры;

в) работа асоб з ліку вольнанаёмнага складу ў воінскіх часцях дзеючай арміі ў перыяд баявых дзеянняў — у двайным размеры;

г) работа і служба, акрамя работы, прадугледжанай пунктам «б» гэтага артыкула, і ваеннай службы, прадугледжанай пунктам «а» гэтага артыкула, у гады Вялікай Айчыннай вайны — у двайным размеры;

д) работа ў лепразорыях, процічумных і інфекцыйных установах па лячэнню асоб, заражаных вірусам імунадэфіцыту чалавека або хворых СНІДам,— у двайным размеры.

Перыяд, указаны ў пункце «з» артыкула 51 гэтага Закона, залічваецца ў працоўны стаж у трайным размеры, а перыяды, указаныя ў пунктах «і», «м» і «н» таго ж артыкула,— у двайным размеры.

Артыкул 53. **Парадак уключэння ў стаж асобных відаў работ**

Работа на водным транспарце на працягу поўнага навігацыйнага перыяду залічваецца за год работы.

Работа на працягу поўнага сезона на прадпрыемствах і ў арганізацыях сезонных галін прамысловасці незалежна ад ведамаснай падпарадкаванасці прадпрыемстваў і арганізацый па спісу, які зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, залічваецца ў стаж за год работы.

Астатнія сезонныя работы залічваюцца ў стаж работы па іх фактычнай працягласці.

Артыкул 54. **Парадак пацвярджэння стажу работы**

Стаж работы пацвярджаецца працоўнай кніжкай, а пры яе адсутнасці — іншымі дакументамі, якія змяшчаюць звесткі аб перыядах работы, або даведкамі аб выплаце страхавых узносаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

Парадак пацвярджэння стажу работы пры адсутнасці працоўнай кніжкі або адпаведных запісаў у ёй устанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 55. **Умовы ўключэння ў стаж замежным грамадзянам часу работы за мяжой**

Замежным грамадзянам і іх сем'ям у тых выпадках, калі для назначэння пенсіі патрабуецца пэўны стаж, пенсіі назначаюцца пры ўмове, што дзве трэці неабходнага стажу прыпадае на работу ў Рэспубліцы Беларусь, калі пагадненнямі (артыкул 1) не прадугледжана іншае.

Раздзел VII.
ВЫЛІЧЭННЕ ПЕНСІЙ

Артыкул 56. **Вылічэнне пенсій у працэнтах да сярэднямесячнага заработку**

Пенсіі вылічваюцца па ўстаноўленых нормах у працэнтах да сярэднямесячнага заработку (што вызначаецца ў адпаведнасці з артыкуламі 57, 58 і 60 гэтага Закона), які грамадзяне атрымлівалі перад зваротам за пенсіяй.

Пры гэтым для разліку пенсіі прымаецца заработак у суме не звыш дзесяцікратнага размеру мінімальнай заработнай платы. Заработак у частцы, якая не перавышае чатырохкратнага размеру мінімальнай заработнай платы, улічваецца пры назначэнні пенсіі поўнасцю. Кожная наступная частка заработку ўлічваецца ў наступным размеры: у межах пятага мінімуму заработнай платы — 85 працэнтаў, шостага — 70 працэнтаў, сёмага — 55 працэнтаў, восьмага — 40 працэнтаў, дзевятага — 25 працэнтаў, дзесятага — 15 працэнтаў. Атрыманы такім чынам сярэднямесячны заработак лічыцца заработкам, з якога вылічана пенсія.

Артыкул 57. **Агульны парадак вызначэння сярэднямесячнага заработку**

Асобам, указаным у артыкуле 5 гэтага Закона, пенсія вылічваецца з сярэднямесячнага фактычнага заработку за любыя 5 гадоў запар (па выбару асобы, якая звярнулася за пенсіяй) з апошніх 15 гадоў работы (выплаты страхавых узносаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь) незалежна ад наяўных перапынкаў.

Сярэднямесячны заработак за 5 гадоў вызначаецца шляхам дзялення агульнай сумы заработку за 60 каляндарных месяцаў работы запар (у межах апошніх 15 гадоў работы) на шэсцьдзесят. Пры гэтым па жаданню асобы, якая звярнулася за пенсіяй, месяцы з няпоўнай колькасцю рабочых дзён у сувязі з паступленнем на работу або са звальненнем улічваюцца як поўныя каляндарныя месяцы работы.

У тых выпадках, калі асоба, якая звярнулася за пенсіяй, прапрацавала менш 5 гадоў, сярэднямесячны заработак вызначаецца шляхам дзялення агульнай сумы заработку за каляндарныя месяцы на колькасць гэтых месяцаў.

Калі работнік прапрацаваў менш аднаго каляндарнага месяца, то заработак за ўвесь прапрацаваны час дзеліцца на колькасць прапрацаваных дзён і атрыманая

сума памнажаецца на колькасць рабочых дзён у месяц, вылічаную ў сярэднім за год.

Пры назначэнні пенсій работнікам, занятым на сезонных работах, сярэднямесячны фактычны заработак вызначаецца шляхам дзялення заработку за 5 поўных сезонаў на шэсцьдзесят.

Па жаданню асобы, якая звярнулася за пенсіяй, не ўключаецца ў 15-гадовы перыяд час работы, на працягу якога яна з'яўлялася інвалідам або атрымлівала кампенсацыю ўрону, прычыненага калецтвам або іншым пашкоджаннем здароўя, ажыццяўляла догляд за інвалідам I групы або дзіцем-інвалідам ва ўзросце да 16 гадоў, а таксама за састарэлым, дасягнуўшым 80-гадовага ўзросту, або знаходзілася ў водпуску па догляду за малалетнімі дзецьмі.

Даведка аб размеры сярэднямесячнага заработку выдаецца прадпрыемствамі (установамі, арганізацыямі) ва ўстаноўленым парадку.

Артыкул 58. **Віды аплаты працы, якія ўлічваюцца пры вылічэнні пенсіі**

У заработак для вылічэння пенсіі ўключаюцца ўсе віды аплаты працы, у тым ліку па сумяшчальніцтву, на якія па дзеючых правілах налічваюцца страхавыя ўзносы.

Прэміі і іншыя віды выплат уключаюцца ў заработак за той месяц, у якім яны атрыманы.

У заработак для вылічэння пенсіі ўключаецца за адпаведныя перыяды дапамога па часовай непрацаздольнасці або сярэдні заработак, які захоўваўся за работнікам.

У заработак для вылічэння пенсіі асобам, якія не падлягаюць дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню (пункт «б» артыкула 51), уключаюцца ўсе віды грашовага забеспячэння, аналагічныя тым відам аплаты працы, на якія налічваюцца страхавыя ўзносы.

У заработак для вылічэння пенсіі членам калгасаў уключаецца аплата ва ўсіх яе відах за работу ў грамадскай гаспадарцы калгаса, а таксама аплата за работу па іншым месцы работы, калі на гэту аплату налічваліся страхавыя ўзносы.

Натуральная частка заработку, на вартасць якой налічваюцца страхавыя ўзносы, улічваецца па дзяржаўных рознічных цэнах таго перыяду, калі праводзілася аплата працы.

Артыкул 59. **Вылічэнне пенсій пры няпоўным стажы работы**

Пенсіі пры няпоўным стажы работы (артыкулы 24,

32, 41) назначаюцца ў размеры, вылічаным прапарцыянальна наяўнаму стажу.

Вылічэнне пенсіі праводзіцца наступным чынам: спачатку вызначаецца адпаведная поўная пенсія, гэта пенсія дзеліцца на колькасць месяцаў патрабуемага поўнага стажу работы, атрыманая сума памнажаецца на колькасць месяцаў наяўнага фактычнага стажу работы (у гэтым стажы перыяд звыш 15 дзён акругляецца да поўнага месяца, а перыяд да 15 дзён уключна не ўлічваецца).

Калі пенсія пры поўным стажы належала б у мінімальным размеры, устаноўленым гэтым Законам (артыкулы 23, 31, 38), то пенсія пры няпоўным стажы назначаецца прапарцыянальна наяўнаму стажу зыходзячы з мінімальнага размеру пенсіі, але ва ўсіх выпадках не менш пенсіі, устаноўленай для адпаведнай катэгорыі непрацаздольных (артыкулы 24, 32, 41).

Артыкул 60. **Вылічэнне пенсій асобным катэгорыям грамадзян**

Навучэнцам, аспірантам і клінічным ардынатарам пры вылічэнні пенсій па іх жаданню за перыяд вучобы замест заработку можа ўлічвацца стыпендыя.

Асобам, якія выплачваюць страхавыя ўзносы ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь (якія займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю, працуюць у асобных грамадзян па працоўных дагаворах і іншых), пенсіі вылічваюцца з сумы, прынятай для вызначэння ўзносаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь, у адпаведнасці з артыкуламі 56—58 гэтага Закона.

Членам творчых саюзаў і іншым творчым работнікам, якія не з'яўляюцца членамі творчых саюзаў, пенсіі вылічваюцца з аўтарскага ганарару, які разлічваецца па дзяржаўных стаўках, за любыя 5 гадоў запар з апошніх 15 гадоў творчай дзейнасці перад зваротам за пенсіяй.

Асобам, указаным у частцы трэцяй гэтага артыкула, калі яны адначасова працуюць на прадпрыемствах або ў арганізацыях, для вылічэння пенсіі ўлічваюцца за адпаведны перыяд аўтарскі ганарар і заработак.

Артыкул 61. **Вылічэнне сярэднямесячнага заработку за перыяд работы за мяжой**

Пры вылічэнні сярэднямесячнага заработку асоб, якія працавалі за межамі Рэспублікі Беларусь, улічваецца

заработная плата, якую яны атрымлівалі да работы за мяжой (артыкулы 56—58, 60), або па іх выбару заработак, які вызначаецца ў адпаведнасці з артыкулам 62 гэтага Закона.

Артыкул 62. **Вылічэнне пенсій грамадзянам Рэспублікі Беларусь — перасяленцам з іншых дзяржаў**

Пенсіі грамадзянам Рэспублікі Беларусь — перасяленцам з іншых дзяржаў, якія не працавалі ў Рэспубліцы Беларусь, вылічваюцца з разліку сярэдняга заработку работнікаў адпаведных прафесій і кваліфікацый у Рэспубліцы Беларусь да часу назначэння пенсіі.

Артыкул 63. **Вылічэнне пенсій круглым сіротам**

Дзецям, якія страцілі абодвух бацькоў (круглым сіротам), пенсіі вылічваюцца з агульнай сумы заработку абодвух бацькоў.

Артыкул 64. **Вылічэнне пенсій сем'ям пенсіянераў**

Сем'ям пенсіянераў пенсіі з выпадку страты карміцеля вылічваюцца з таго ж заработку, з якога вылічвалася пенсія карміцеля.

Артыкул 65. **Вылічэнне пенсій пры пераводзе з адной пенсіі на іншую**

Пры пераводзе з адной пенсіі на іншую сярэднямесячны заработак вызначаецца на агульных падставах, устаноўленых гэтым Законам. Пенсія па новай падставе можа таксама вылічвацца (па жаданню пенсіянера) з таго заработку, з якога вызначалася раней назначаная пенсія.

Артыкул 66. **Пераразлік пенсій па ўзросту, назначаных на льготных падставах**

Грамадзянам, якім назначаны пенсіі па ўзросту на льготных падставах (артыкулы 3, 12, 13, 15, 17—22), па дасягненні ўзросту, прадугледжанага артыкулам 11 гэтага Закона, праводзіцца пераразлік пенсіі з улікам стажу работы пасля назначэння пенсіі.

Артыкул 67. **Пераразлік пенсій пры няпоўным стажы работы**

Калі пенсіянер, якому назначана пенсія пры няпоўным стажы па ўзросту або па інваліднасці (артыкулы 24, 32), а таксама прапарцыянальна адпрацаванаму часу за выслугу гадоў (пункт «а» артыкула 47), прапрацаваў пасля назначэння пенсіі не менш 2 гадоў, то па яго заяве праводзіцца пераразлік пенсіі зыходзячы са стажу, які ёсць да часу пераразліку. Кожны наступны пераразлік пенсіі праводзіцца не раней чым праз 2 гады работы пасля папярэдняга пераразліку.

Калі пенсіянер, працягваючы працаваць, набыў стаж, дастатковы для назначэння поўнай пенсіі, то па заяве пенсіянера праводзіцца адпаведны перараздлік пенсіі незалежна ад таго, колькі часу прайшло пасля яе назначэння. Пры гэтым поўная пенсія па інваліднасці ўстанаўліваецца пры ўмове, калі пенсіянер мае стаж, дастатковы для назначэння поўнай пенсіі адпаведна ўзросту пенсіянера да часу наступлення інваліднасці (артыкул 30).

Перараздлік пенсіі праводзіцца з заработку, з якога пенсія была першапачаткова назначана, з прымяненнем артыкула 70 гэтага Закона.

Артыкул 68. **Павышэнне пенсій**

Пенсіі, назначаныя ў адпаведнасці з гэтым Законам, павышаюцца:

а) інвалідам вайны I і II груп — на 150 працэнтаў, інвалідам III групы — на 75 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту;

удзельнікам вайны з ліку ваеннаслужачых, якія праходзілі службу ў складзе дзеючай арміі, партызанскіх атрадах і злучэннях, ваеннаслужачым, прымаўшым удзел у баявых дзеяннях пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку,— на 50 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту;

асобам, з ліку вольнанаёмнага складу, якія праходзілі службу або працавалі ў складзе дзеючай арміі,— на 25 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту;

асобам, якія працавалі ў перыяд блакады горада Ленінграда на прадпрыемствах, ва ўстановах і ў арганізацыях горада,— на 25 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту;

вязням фашысцкіх канцлагераў (гета і іншых месцаў прымусовага ўтрымання ў перыяд вайны), калі яны не ўчынілі ў гэты перыяд злачынстваў супраць Радзімы,— на 25 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту;

інвалідам з дзяцінства з прычыны ранення, кантузіі або калецтва, звязаных з баявымі дзеяннямі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны (або з вынікамі ваенных дзеянняў),— на 15 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту;

асобам, узнагароджаным ордэнамі і медалямі за самаадданую працу і бездакорную воінскую службу ў тыле ў гады Вялікай Айчыннай вайны,— на 15 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту;

б) бацькам, дзецям — інвалідам з дзяцінства і жонкам

(не ўступіўшым у новы шлюб) ваеннаслужачых, смерць якіх звязана з выкананнем абавязкаў ваеннай службы,— на 25 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту;

в) грамадзянам, неабгрунтавана рэпрэсіраваным па палітычных матывах у перыяд рэпрэсій 20—80-ых гадоў і ў далейшым рэабілітаваным,— на 25 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту.

Пры наяўнасці права на павышэнне пенсіі па розных падставах, прадугледжаных пунктам «а» гэтага артыкула, налічваецца адно з указаных у ім павышэнняў.

Артыкул 69. **Пераразлік пенсій у сувязі з павелічэннем мінімальнай заработнай платы**

Мінімальныя размеры пенсій (артыкулы 23, 31, 38), а таксама гранічныя размеры заработку, які ўлічваецца для вылічэння пенсій (артыкул 56), павышаюцца ў сувязі з павелічэннем мінімальнай заработнай платы. Пры гэтым павышэнне пенсій праводзіцца з месяца, што ідзе за тым, з якога праведзена павелічэнне мінімальнай заработнай платы.

Артыкул 70. **Павышэнне пенсіі ў сувязі з ростам сярэдняй заработнай платы**

У сувязі з ростам сярэдняй заработнай платы ў рэспубліцы штоквартальна праводзяцца індэксацыя заработку, з якога вылічана пенсія, і адпаведны пераразлік пенсіі.

Для індэксацыі заработку вызначаецца індывідуальны каэфіцыент, што атрымліваецца шляхам суадносін заработку, з якога вылічана пенсія, і велічыні сярэдняй заработнай платы ў рэспубліцы ў перыяд назначэння пенсіі. Па меры росту заработнай платы ў рэспубліцы яе сярэднямесячная велічыня, якая прымяняецца ў бягучым квартале, памнажаецца на індывідуальны каэфіцыент і з атрыманага такім чынам заработку вылічваецца пенсія.

Парадак пераразліку пенсій у адпаведнасці з гэтым артыкулам зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 71. **Вызначэнне сумы заработку і размеру пенсіі**

Пры вылічэнні сумы сярэднямесячнага заработку і ўстанаўленні размеру пенсіі дробная частка грашовай адзінкі, меншая за палавіну, не ўлічваецца, а большая за палавіну акругляецца ў большы бок.

Раздзел VIII.
САЦЫЯЛЬНЫЯ ПЕНСІІ

Артыкул 72. **Грамадзяне, якія маюць права на пенсію**

Сацыяльныя пенсіі назначаюцца грамадзянам, якія не атрымліваюць працоўную пенсію:

інвалідам, у тым ліку інвалідам з дзяцінства;

асобам, якія дасягнулі ўзросту: мужчыны — 60 гадоў, жанчыны — 55 гадоў;

дзецям — у выпадку страты карміцеля (пункт «а» артыкула 35);

дзецям-інвалідам ва ўзросце да 16 гадоў.

Пералік медыцынскіх паказанняў, якія даюць права на атрыманне сацыяльнай пенсіі на дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 16 гадоў, вызначаецца ў парадку, што ўстанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 73. **Размеры пенсій**

Сацыяльныя пенсіі назначаюцца ў наступных размерах:

а) інвалідам I групы, інвалідам з дзяцінства I і II груп і дзецям-інвалідам ва ўзросце да 16 гадоў — 100 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту (артыкул 23);

б) інвалідам II групы (акрамя інвалідаў з дзяцінства); асобам, якія дасягнулі ўзросту: мужчыны — 60 гадоў, жанчыны — 55 гадоў; дзецям у выпадку страты карміцеля (пункт «а» артыкула 35) на кожнае дзіця — 50 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту;

в) інвалідам III групы — 30 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту.

Артыкул 74. **Надбаўка да пенсіі**

Да сацыяльнай пенсіі інвалідам I групы ўстанаўліваецца надбаўка на догляд за імі ў размеры 50 працэнтаў мінімальнага размеру пенсіі па ўзросту.

Раздзел IX.
НАЗНАЧЭННЕ ПЕНСІЙ

Артыкул 75. Парадак звароту за назначэннем пенсіі

Заява аб назначэнні пенсіі рабочым, служачым і членам іх сем'яў (у выпадку страты карміцеля) падаецца праз адміністрацыю прадпрыемства, установы, арганізацыі па месцы апошняй работы.

Заява аб назначэнні пенсіі членам калгасаў, кааператываў і іх сем'ям падаецца праз праўленне калгаса (кааператыва).

Адміністрацыя (праўленне) у 10-дзённы тэрмін з дня паступлення заявы афармляе неабходныя дакументы аб стажы і заработку і разам з пададзенай заявай і сваім прадстаўленнем накіроўвае іх у раённы (гарадскі) аддзел сацыяльнага забеспячэння па месцы жыхарства заяўніка або ў парадку, які вызначаецца рэспубліканскім органам сацыяльнага забеспячэння,— у раённы (гарадскі) аддзел сацыяльнага забеспячэння па месцы знаходжання прадпрыемства або арганізацыі. Калі работніку, які звярнуўся за назначэннем пенсіі, адмоўлена ў прадстаўленні да назначэння пенсіі, яму паведамляецца аб гэтым у пісьмовай форме з указаннем прычын адмовы.

У тых выпадках, калі асоба, якая звярнулася за пенсіяй, не згодна з рашэннем адміністрацыі (праўлення) аб адмове ў прадстаўленні яе да назначэння пенсіі, яна можа падаць заяву аб назначэнні пенсіі непасрэдна ў раённы (гарадскі) аддзел сацыяльнага забеспячэння.

Заява аб назначэнні пенсіі іншым грамадзянам і членам іх сем'яў падаецца непасрэдна ў раённы (гарадскі) аддзел сацыяльнага забеспячэння па месцы жыхарства заяўніка.

Аддзелы сацыяльнага забеспячэння абавязаны даваць растлумачэнні і даведкі па пытаннях назначэння пенсій, а таксама садзейнічаць заяўніку ў атрыманні неабходных дакументаў.

Аддзелы сацыяльнага забеспячэння маюць права патрабаваць адпаведныя дакументы ад прадпрыемстваў, арганізацый і асобных людзей, а таксама правяраць у неабходных выпадках абгрунтаванасць іх выдачы, за-

пытваць у органах дзяржаўнай экспертызы ўмоў працы заключэнні аб абгрунтаванасці выдачы дакументаў аб занятасці на работах з асаблівымі ўмовамі працы.

Патрабаванні органаў сацыяльнага забеспячэння аб выдачы адпаведных дакументаў і заключэнняў з'яўляюцца абавязковымі для выканання.

Артыкул 76. **Адказнасць прадпрыемстваў і арганізацый за своечасовасць і паўнату афармлення дакументаў і дакладнасць звестак, якія ў іх змяшчаюцца**

Прадпрыемствы і арганізацыі абавязаны своечасова афармляць дакументы аб стажы і заработку, неабходныя для назначэння пенсіі, і своечасова прадстаўляць іх у органы сацыяльнага забеспячэння.

Прадпрыемствы і арганізацыі нясуць матэрыяльную адказнасць перад пенсіянерам за ўрон, прычынены несвоечасовым і няпоўным афармленнем дакументаў, неабходных для назначэння і перараздзіку пенсіі, а таксама прадстаўленнем дакументаў, якія змяшчаюць недакладныя звесткі, у парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

У выпадках, калі праведзена пераплата пенсіі на падставе ўказаных у дакументах недакладных звестак, прадпрыемства, арганізацыя кампенсуюць Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь прычынены ўрон.

Артыкул 77. **Органы, якія назначаюць пенсіі**

Пенсіі назначаюцца кіраўніком раённага (гарадскога) аддзела сацыяльнага забеспячэння. Аднак ва ўсіх выпадках па патрабаванню асобы, якая звярнулася за пенсіяй, і іншых зацікаўленых асоб, прадпрыемстваў і арганізацый пытанне аб назначэнні пенсіі вырашаецца камісіяй па назначэнню пенсій, што ўтвараецца раённым (гарадскім) Саветам народных дэпутатаў. Камісія ўтвараецца ў складзе, які вызначаецца Саветам народных дэпутатаў. Разам з іншымі членамі ў склад камісіі ўключаецца кіраўнік раённага (гарадскога) аддзела сацыяльнага забеспячэння.

Артыкул 78. **Тэрміны разгляду дакументаў аб назначэнні пенсій**

Дакументы аб назначэнні пенсій разглядаюцца органамі, якія назначаюць пенсіі (артыкул 77), не пазней 10 дзён з дня іх паступлення.

Рашэнне аб адмове ў назначэнні пенсіі па матывах неадпаведнасці ўмовам, прадугледжаным гэтым Законам, ва ўсіх выпадках прымаецца толькі камісіяй па назначэнню пенсій. Аб даце пасяджэння камісіі папярэдне паведамляецца прадпрыемству, арганізацыі або заяўніку.

Аддзел сацыяльнага забеспячэння не пазней 5 дзён пасля вынясення адпаведнага рашэння выдае або пасылае прадпрыемству або заяўніку паведамленне аб адмове ў назначэнні пенсіі з указаннем прычын адмовы і парадку абскарджання і адначасова вяртае ўсе дакументы.

Артыкул 79. **Абскарджанне рашэнняў камісій па назначэнню пенсій**

Скарга на рашэнне камісіі па назначэнню пенсій можа быць пададзена ў раённы (гарадскі) Савет народных дэпутатаў або ў раённы (гарадскі) народны суд. Орган, які разглядае спрэчку, пры неабходнасці можа запатрабаваць заключэнне вышэйстаячага органа сацыяльнага забеспячэння або дзяржаўнай экспертызы ўмоў працы.

Артыкул 80. **Тэрміны назначэння пенсій**

Пенсіі назначаюцца з дня звароту за пенсіяй, акрамя наступных выпадкаў, калі пенсіі назначаюцца з больш ранняга тэрміну:

а) пенсіі па інваліднасці назначаюцца з дня ўстанаўлення інваліднасці, калі зварот за пенсіяй адбыўся не пазней 3 месяцаў з дня ўстанаўлення інваліднасці;

б) пенсіі з выпадку страты карміцеля назначаюцца з дня ўзнікнення права на пенсію, але не больш чым за 12 месяцаў перад зваротам за пенсіяй.

Днём звароту за пенсіяй лічыцца дзень прыёму заявы (прадстаўлення) аб назначэнні пенсіі з усімі неабходнымі дакументамі органамі сацыяльнага забеспячэння.

Калі заява (прадстаўленне) аб назначэнні пенсіі перасылаецца па пошце і пры гэтым прыкладаюцца ўсе неабходныя дакументы, то днём звароту за пенсіяй лічыцца дата, указаная на паштовым штэмпелі месца іх адпраўлення.

У тых выпадках, калі да заявы (прадстаўлення) прыкладзены не ўсе неабходныя дакументы, аддзел сацыяльнага забеспячэння паведамляе адміністрацыі прадпрыемства, установы, арганізацыі або заяўніку, якія дакументы павінны быць прадстаўлены дадаткова. Калі яны будуць прадстаўлены не пазней аднаго месяца з дня атрымання паведамлення аб неабходнасці прадстаўлення дадатковых дакументаў, то днём звароту за пенсіяй

лічыцца дзень прыёму заявы (прадстаўлення) аб назначэнні пенсіі ці дата, указаная на паштовым штэмпелі месца іх адпраўлення.

Артыкул 81. **Тэрміны перараздзіку назначанай пенсіі.**

Пры ўзнікненні права на павышэнне пенсіі або пры наступленні прадугледжаных гэтым Законам абставін, якія цягнуць памяншэнне пенсіі або спыненне выплаты пенсіі, перараздзік назначанай пенсіі або спыненне яе выплаты праводзіцца з першага чысла месяца, што ідзе за тым, у якім пенсіянер звярнуўся за перараздзікам пенсіі або насталі гэтыя абставіны, акрамя наступных выпадкаў:

а) пры змяненні групы інваліднасці пенсія ў новым размеры выплачваецца з дня змянення групы інваліднасці;

б) пры прызнанні паўторна агледжанага працаздольным пенсія выплачваецца да канца месяца, у якім ён прызнаны працаздольным, але не даўжэй чым да дня, па які ўстаноўлена інваліднасць.

Артыкул 82. **Перавод з адной пенсіі на іншую**

Перавод з адной пенсіі на іншую праводзіцца кіраўніком раённага (гарадскога) аддзела сацыяльнага забеспячэння з дня падачы адпаведнай заявы з усімі неабходнымі дакументамі (калі іх няма ў пенсіённай справе).

Раздзел X.
ВЫПЛАТА ПЕНСІЙ

Артыкул 83. **Парадак выплаты пенсій**

Пенсіі выплачваюцца органамі сацыяльнага забеспячэння без уліку атрымліваемага заработку (даходу) па месцы фактычнага жыхарства пенсіянера.

Пенсіі за выслугу гадоў у перыяд работы, якая дае права на гэту пенсію, не выплачваюцца.

Дастаўка і перасылка пенсій ажыццяўляюцца за кошт сродкаў Фонда сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 84. **Выплата пенсіі асобам, якія пражываюць у дамах-інтэрнатах для састарэлых і інвалідаў**

Пенсіянерам, якія пражываюць у дамах-інтэрнатах (пансіянатах, тэрытарыяльных цэнтрах) для састарэлых і інвалідаў, выплачваецца 10 працэнтаў назначанай пенсіі, але не менш 20 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту ў месяц. У тых выпадках, калі размер іх пенсіі перавышае кошт утрымання ў гэтых дамах-інтэрнатах (пансіянатах, тэрытарыяльных цэнтрах), выплачваецца розніца паміж пенсіяй і коштам утрымання, але не менш 10 працэнтаў назначанай пенсіі і не менш 20 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту ў месяц.

Інвалідам вайны і іншым удзельнікам вайны пенсіі выплачваюцца ў такім жа парадку, але не менш 25 працэнтаў назначанай пенсіі і не менш 20 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту.

Калі ў пенсіянера, які пражывае ў доме-інтэрнаце (пансіянаце, тэрытарыяльным цэнтры) для састарэлых і інвалідаў, ёсць дзеці (пункт «а» артыкула 35), то пенсія выплачваецца ў наступным парадку: на адно дзіця — 25 працэнтаў, на двух дзяцей — 33 працэнты, на трох або больш дзяцей — 50 працэнтаў назначанай пенсіі, самому пенсіянеру — частка пенсіі, якая засталася, за вылікам кошту ўтрымання ў доме-інтэрнаце (пансіянаце, тэрытарыяльным цэнтры), але не менш 10 працэнтаў (інвалідам вайны і іншым удзельнікам вайны — не менш 25 працэнтаў) назначанай пенсіі і не менш 20 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту.

Артыкул 85. **Выплата пенсіі дзецям, якія знаходзяцца на поўным дзяржаўным утрыманні**

Дзецям, якія страцілі абодвух бацькоў (круглым сіротам), а таксама дзецям памёршай адзінокай маці за перыяд знаходжання на поўным дзяржаўным утрыманні выплачваецца 50 працэнтаў назначанай пенсіі. Пенсіі пералічваюцца ў ашчадны банк на асабовыя рахункі дзяцей.

Іншым дзецям, якія знаходзяцца на поўным дзяржаўным утрыманні, выплачваецца 25 працэнтаў назначанай пенсіі.

Артыкул 86. **Выплата пенсіі ў перыяд знаходжання на стацыянарным лячэнні**

За час знаходжання пенсіянера на стацыянарным лячэнні ў бальніцы, клініцы, шпіталі і іншых лячэбных установах, а таксама ў лепразорыі пенсія выплачваецца поўнасцю.

Артыкул 87. **Выплата пенсіі па даверанасці і парадак яе афармлення**

Пенсія можа выплачвацца па даверанасці. Даверанасць можа быць выдадзена на тэрмін не звыш аднаго года.

Даверанасць павінна быць засведчана ў натарыяльным парадку або арганізацыяй жыллёвай гаспадаркі па месцы жыхарства пенсіянера, або лячэбнай установай, у якой пенсіянер знаходзіцца на стацыянарным лячэнні.

Артыкул 88. **Прыпыненне выплаты пенсіі на час пазбаўлення волі**

У выпадку пазбаўлення пенсіянера волі выплата назначанай пенсіі прыпыняецца на час пазбаўлення волі.

Артыкул 89. **Умовы аднаўлення выплаты пенсіі пры перапынках у інваліднасці**

Калі інвалід не з'явіўся ў МРЭК на паўторны агляд у назначаны для гэтага тэрмін, то выплата пенсіі прыпыняецца, а ў выпадку прызнання яго зноў інвалідам — аднаўляецца з дня прыпынення, але не больш чым за адзін месяц.

Пры пропуску тэрміну паўторнага агляду па ўважлівай прычыне выплата пенсіі на падставе рашэння камісіі па назначэнню пенсій праводзіцца з дня прыпынення выплаты да дня паўторнага агляду,але не больш чым

за 3 гады, калі МРЭК прызнае яго за гэты перыяд інвалідам. Пры гэтым калі пры паўторным аглядзе інвалід пераведзены ў іншую групу інваліднасці (больш высокую або больш нізкую), то пенсія за ўказаны час выплачваецца па ранейшай групе.

Калі выплата пенсіі інваліду, які страціў працаздольнасць у выніку агульнага захворвання, была спынена з прычыны аднаўлення працаздольнасці або калі ён не атрымліваў пенсію ў выніку няяўкі на паўторны агляд без уважлівых прычын, то ў выпадку наступнага прызнання яго інвалідам выплата раней назначанай пенсіі аднаўляецца з дня ўстанаўлення інваліднасці зноў пры ўмове, калі пасля спынення выплаты пенсіі прайшло не больш 5 гадоў. Калі прайшло больш 5 гадоў, пенсія назначаецца зноў на агульных падставах.

Артыкул 90. **Выплата пенсіі за мінулы час**

Налічаныя сумы пенсіі, не запатрабаваныя пенсіянерам своечасова, выплачваюцца за мінулы час не больш чым за 3 гады перад зваротам за атрыманнем пенсіі.

Сумы пенсіі, не атрыманыя своечасова па віне органа, які назначае або выплачвае пенсію, выплачваюцца за мінулы час без абмежавання якім-небудзь тэрмінам.

Артыкул 91. **Выплата недаатрыманай пенсіі ў сувязі са смерцю пенсіянера і выплата дапамогі на пахаванне**

Сумы пенсіі, якія належалі пенсіянеру і засталіся недаатрыманымі ў сувязі з яго смерцю, не ўключаюцца ў склад спадчыны і выплачваюцца тым членам яго сям'і, якія адносяцца да кола асоб, што забяспечваюцца пенсіяй з выпадку страты карміцеля (артыкулы 35, 36). Аднак бацькі, муж (жонка), дзеці, а таксама члены сям'і, якія пражывалі сумесна з пенсіянерам на дзень яго смерці, маюць права на атрыманне гэтых сум і ў тым выпадку, калі яны не ўваходзяць у кола забяспечваемых пенсіяй з выпадку страты карміцеля.

Пры звароце некалькіх членаў сям'і належная ім сума пенсіі дзеліцца паміж імі пароўну.

Указаныя сумы выплачваюцца з прымяненнем артыкула 90 гэтага Закона, калі зварот за імі адбыўся не пазней 6 месяцаў пасля смерці пенсіянера.

У выпадку смерці пенсіянера яго сям'і або асобам, якія не з'яўляюцца членамі сям'і, але праводзілі пахаванне пенсіянера, выплачваецца дапамога на пахаванне ў размеры, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі

Беларусь, але не менш пяцікратнага размеру мінімальнай заработнай платы.

Артыкул 92. **Выплата пенсій грамадзянам, якія выехалі за мяжу**

Пенсіі, назначаныя ў Рэспубліцы Беларусь да выезду на пастаяннае жыхарства за мяжу, выплачваюцца за 6 месяцаў наперад перад ад'ездам за мяжу. Пенсіі, назначаныя з прычыны працоўнага калецтва або прафесіянальнага захворвання, выплачваюцца за ўвесь час знаходжання за мяжой.

Парадак пераводу пенсій, назначаных з прычыны працоўнага калецтва або прафесіянальнага захворвання, у іншыя дзяржавы вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 93. **Абавязак пенсіянераў і кіраўнікоў устаноў паведамляць аддзелам сацыяльнага забеспячэння аб змяненні ўмоў, якія ўплываюць на выплату пенсій**

Пенсіянер абавязаны паведамляць органу, які выплачвае яму пенсію, аб абставінах, якія цягнуць змяненне размеру пенсіі або спыненне яе выплаты.

Пры паступленні асобы, якой назначана пенсія, на поўнае дзяржаўнае ўтрыманне кіраўнік адпаведнй установы абавязаны паведаміць аб гэтым у 5-дзённы тэрмін органу, які выплачвае пенсію.

У выпадку парушэння патрабаванняў гэтага артыкула пенсіянеры нясуць адказнасць у размеры фактычнага ўрону, а службовыя асобы — у парадку, які вызначаецца дзеючым заканаўствам.

Артыкул 94. **Утрыманні з пенсій**

Утрыманні з пенсій могуць праводзіцца:

а) на падставе судовых рашэнняў, вызначэнняў, пастаноў і прыгавораў (у частцы маёмасных спагнанняў), выканаўчых надпісаў натарыяльных кантор і іншых рашэнняў і пастаноў, выкананне якіх у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь праводзіцца ў парадку, устаноўленым для выканання судовых рашэнняў;

б) на падставе рашэнняў камісій па назначэнню пенсій для спагнання сум пенсій, залішне выплачаных пенсіянеру з прычыны злоўжываннняў з яго боку (у выніку прадстаўлення дакументаў з заведама няправільнымі звесткамі, утойвання факта працы і да т. п.).

Ніякія іншыя ўтрыманні з пенсій, акрамя ўказаных вышэй, не дапускаюцца.

Размер утрымання з пенсіі вылічваецца з сумы, якая належыць пенсіянеру да выплаты.

З пенсіі можа быць утрымана не больш 50 працэнтаў пенсіі: на ўтрыманне членаў сям'і (аліменты), на пакрыццё ўрону ад крадзяжоў маёмасці прадпрыемстваў і арганізацый, на пакрыццё шкоды, прычыненай калецтвам або іншым пашкоджаннем здароўя, а таксама ў сувязі са смерцю карміцеля, на вяртанне пераатрыманых сум заработнай платы ў прадугледжаных заканадаўствам выпадках.

Па ўсіх астатніх відах спагнанняў можа быць утрымана не звыш 20 працэнтаў пенсіі.

Утрыманні на падставе рашэнняў камісій па назначэнню пенсій праводзяцца ў размеры не больш 20 працэнтаў пенсіі звыш утрыманняў па іншых падставах.

Ва ўсіх выпадках звароту спагнанняў на пенсію за пенсіянерам захоўваецца не менш 50 працэнтаў належнай пенсіі.

У выпадку спынення выплаты пенсіі (з прычыны аднаўлення працаздольнасці і да т. п.) да поўнага пагашэння запазычанасці па залішне выплачаных сумах пенсіі, якія ўтрымліваюцца на падставе рашэнняў камісій па назначэнню пенсій, запазычанасць, якая засталася, спаганяецца ў судовым парадку.

Раздзел XI.
ПЕРАРАЗЛІК ПЕНСІЙ У СУВЯЗІ З УВЯДЗЕННЕМ У ДЗЕЯННЕ ГЭТАГА ЗАКОНА

Артыкул 95. **Пераразлік раней назначаных пенсій**

Пераразлік пенсій праводзіцца на падставе дакументаў аб узросце, стажы, сярэднямесячнага заработку і іншых, якія ёсць да часу пераразліку ў пенсіённай справе. Калі пенсіянер у далейшым прадставіць дадатковыя дакументы, якія даюць права на далейшае павышэнне пенсіі ў сувязі з увядзеннем у дзеянне гэтага Закона, то пенсія зноў пераразлічваецца па нормах гэтага Закона. Пры гэтым пераразлік праводзіцца за мінулы час, але не больш чым за 12 месяцаў перад прадстаўленнем дадатковых дакументаў і не раней чым з дня ўвядзення ў дзеянне гэтага Закона.

Артыкул 96. **Заработак, з якога вылічваецца пенсія пры пераразліку**

Пераразлік раней назначаных пенсій праводзіцца з сярэднямесячнага заработку, з якога вылічана пенсія, па дакументах, што ёсць у пенсіённай справе. Гэты заработак павялічваецца на індэкс росту сярэднямесячнай заработнай платы ў рэспубліцы за перыяд, які прайшоў з моманту вылічэння пенсіі.

Парадак пераразліку пенсій у адпаведнасці з гэтым артыкулам зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета
Рэспублікі Беларусь
С. ШУШКЕВІЧ

17 красавіка 1992 г.
г. Мінск

ПАСТАНОВА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

АБ ПАРАДКУ ЎВЯДЗЕННЯ Ў ДЗЕЯННЕ ЗАКОНА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ ПЕНСІЁННЫМ ЗАБЕСПЯЧЭННІ»

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь пастанаўляе:

1. Увесці ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь «Аб пенсіённым забеспячэнні» з 1 студзеня 1993 года.

Грамадзянам, якім пенсія назначана да ўвядзення ў дзеянне гэтага Закона, што не маюць па ўмовах і нормах дадзенага Закона права на больш высокую пенсію, яна выплачваецца ў размерах не ніжэй прадугледжаных заканадаўствам да ўвядзення ў дзеянне ўказанага Закона.

2. Устанавіць, што пры назначэнні пенсій па жаданню пенсіянераў у 1993 годзе пенсіі могуць вылічацца з сярэднямесячнага заработку за два апошнія гады работы, у 1994 годзе — за тры, у 1995 годзе — за чатыры апошнія гады работы.

3. Устанавіць, што:

работа ў СССР залічваецца ў стаж работы для назначэння пенсіі па правілах артыкулаў 51—54 гэтага Закона;

незалежна ад палажэнняў артыкула 51 гэтага Закона час работы пасля назначэння пенсіі ў перыяд да 1 студзеня 1991 года ўлічваецца пры павелічэнні размеру пенсіі (артыкул 23 гэтага Закона);

творчая дзейнасць членаў творчых саюзаў і іншых творчых работнікаў, якія не з'яўляюцца членамі творчых саюзаў, але аб'ядноўваюцца адпаведнымі прафесіянальнымі камітэтамі, а таксама работа ў асобных грамадзян да 1 студзеня 1991 года залічваецца ў працоўны стаж незалежна ад выплаты страхавых узносаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь;

час службы ў якасці свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў да 1 красавіка 1992 года залічваецца ў працоўны стаж незалежна ад выплаты страхавых узносаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

4. Устанавіць, што асобам, якія прапрацавалі да дня ўвядзення ў дзеянне гэтага Закона не менш 15 каляндарных гадоў у раёнах Крайняй Поўначы або не менш 20 каляндарных гадоў у мясцовасцях, прыраўнаваных да

раёнаў Крайняй Поўначы, пенсіі па ўзросту ў размерах, прадугледжаных гэтым Законам, назначаюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі па ўзросту і стажу, устаноўленымі раней дзеючым заканаўствам. Пры вызначэнні права на пенсію прымяняецца дзеючы да дня звароту за назначэннем пенсіі пералік раёнаў Крайняй Поўначы і мясцовасцей, прыраўнаваных да раёнаў Крайняй Поўначы, зацверджаны Урадам Расійскай Федэрацыі.

5. Даручыць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у тэрмін да 1 снежня 1992 года:

распрацаваць і зацвердзіць спісы і пералікі вытворчасцей, работ, прафесій, пасад і паказчыкаў, якія даюць права на атрыманне пенсій за работу з асаблівымі ўмовамі працы і пенсій за выслугу гадоў, а таксама парадак і ўмовы назначэння пенсій за выслугу гадоў у адпаведнасці з артыкуламі 47 і 49 гэтага Закона;

прадставіць у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь для зацвярджэння праект Палажэння аб Фондзе сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь;

на працягу 1992 года:

зацвердзіць парадак карэкціроўкі сярэднямесячнага заработку, які вызначаецца пры назначэнні пенсіі (артыкул 57 гэтага Закона і пункт 2 гэтай Пастановы), у сувязі з павелічэннем тарыфных ставак і акладаў;

прыняць неабходныя нарматыўныя акты па пытаннях, аднесеных Законам Рэспублікі Беларусь «Аб пенсіённым забеспячэнні» да кампетэнцыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь;

прадставіць у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прапановы аб унясенні ў дзеючае заканадаўства змяненняў і дапаўненняў, якія вынікаюць з Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсіённым забеспячэнні»;

прывесці акты Урада Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб пенсіённым забеспячэнні» і забяспечыць перагляд і адмену міністэрствамі, дзяржаўнымі камітэтамі і ведамствамі Рэспублікі Беларусь іх нарматыўных актаў, у тым ліку інструкцый, якія супярэчаць гэтаму Закону;

ажыццявіць неадкладныя мерапрыемствы па ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы сістэмы органаў сацыяльнага забеспячэння, найбольш поўнаму аснашчэнню іх сучаснымі сродкамі вылічальнай і размнажальнай тэхнікі, сувязі і транспарту, укамплектаванню кваліфікаванымі кадрамі;

вырашыць пытанне аб устанаўленні на перыяд пад-

рыхтоўкі і правядзення перараслікаў пенсій даплат да заработнай платы работнікам органаў сацыяльнага забеспячэння і матэрыяльным стымуляванні работнікаў, якія прыцягваюцца да гэтай работы.

6. Камісіі па пытаннях працы, цэн, занятасці і сацыяльнай абароненасці насельніцтва ўнесці прапанову аб унясенні змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб індэксацыі даходаў насельніцтва з улікам інфляцыі», якія вынікаюць з артыкула 70 Закона «Аб пенсіённым забеспячэнні».

7. Устанавіць, што тарыфы страхавых узносаў на пенсіённае забеспячэнне, якія выплачваюцца прадпрыемствамі, арганізацыямі, калгасамі і іншымі кааператывамі, грамадзянамі, што займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю, штогод зацвярджаюцца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь па прадстаўленню Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

8. Рэкамендаваць мясцовым Саветам народных дэпутатаў ажыццяўляць меры па забеспячэнню дадатковых гарантый сацыяльнай абароненасці і паляпшэнню ўмоў жыцця ветэранаў вайны і працы, інвалідаў і сем'яў, якія страцілі карміцеля, і асабліва па ўзмацненню клопату аб менш забяспечаных катэгорыях пенсіянераў.

Старшыня Вярхоўнага Савета
Рэспублікі Беларусь
С. ШУШКЕВІЧ

17 красавіка 1992 г.
г. Мінск

Закон Республики Беларусь О пенсионном обеспечении

Принят на сессии
Верховного Совета
Республики Беларусь
17 апреля 1992 г.

Раздел I.
ОБЩИЕ ПОЛОЖЕНИЯ

Статья 1. **Право граждан в Республике Беларусь на государственное пенсионное обеспечение**

Граждане Республики Беларусь имеют право на государственное пенсионное обеспечение в старости, при инвалидности, потере кормильца и в иных случаях, предусмотренных настоящим Законом.

Пенсионное обеспечение граждан Республики Беларусь, проживающих за ее пределами, производится на основе соглашений (договоров) с другими государствами.

Постоянно проживающие в Республике Беларусь граждане других государств и лица без гражданства имеют право на пенсию наравне с гражданами Республики Беларусь, если иное не предусмотрено законодательством.

В тех случаях, когда соглашениями (договорами) о социальном обеспечении между Республикой Беларусь и другими государствами предусмотрены иные правила, чем те, которые содержатся в настоящем Законе, соответственно применяются правила, установленные этими соглашениями (договорами).

Статья 2. **Пенсионное обеспечение военнослужащих и их семей**

Условия, нормы и порядок пенсионного обеспечения военнослужащих, а также лиц начальствующего и рядового состава органов внутренних дел и членов их семей регулируются законодательством о пенсионном обеспечении военнослужащих.

Военнослужащим, лицам начальствующего и рядового состава органов внутренних дел и членам их семей предоставляется также право на получение пенсий на основаниях, предусмотренных настоящим Законом. При этом все виды денежного довольствия военнослужащих, а также лиц начальствующего и рядового состава органов внутренних дел учитываются наравне с заработной платой рабочих и служащих.

Статья 3. **Пенсионное обеспечение лиц, пострадавших в результате катастрофы на Чернобыльской АЭС, и членов их семей**

Пенсионное обеспечение лиц, пострадавших в результате катастрофы на Чернобыльской АЭС, и членов их семей производится с учетом условий и норм, предусмотренных Законом Республики Беларусь «О социальной защите граждан, пострадавших от катастрофы на Чернобыльской АЭС».

Статья 4. **Виды пенсий**

По настоящему Закону назначаются:

а) трудовые пенсии:

по возрасту;

по инвалидности;

по случаю потери кормильца;

за выслугу лет;

б) социальные пенсии.

Статья 5. **Лица, имеющие право на пенсию**

Право на трудовую пенсию имеют лица, занятые общественно полезным трудом или иной деятельностью, засчитываемой в стаж работы (часть первая и пункты «а» — «н» статьи 51 настоящего Закона), и их семьи, а также учащиеся общеобразовательных школ (пункт «ж» статьи 29) при соблюдении других условий, предусмотренных настоящим Законом.

Нетрудоспособные граждане, не получающие трудовую пенсию, имеют право на социальную пенсию на условиях, определяемых настоящим Законом.

Статья 6. **Право выбора пенсии**

Лицам, имеющим одновременно право на различные государственные пенсии, назначается одна пенсия по их выбору.

Статья 7. **Обращение за назначением пенсии**

Обращение за назначением пенсии может осуществляться в любое время после возникновения права на пенсию без ограничения каким-либо сроком.

При этом пенсии по возрасту и по инвалидности назначаются независимо от того, прекращена работа ко времени обращения за пенсией или продолжается. Пенсии за выслугу лет назначаются при оставлении работы, дающей право на эту пенсию.

Статья 8. **Средства на выплату пенсий. Освобождение пенсий от налогов**

